Украіна — самая вялікая ўнутрыкантынентальная краіна Еўропы. Менавіта яна першай у свеце прызнала суверэнітэт Беларусі і ўстанавіла з нашай рэспублікай дыпламатычныя адносіны. СТАР 2

Ручкі Лілії Зарэцкай па-ранейшаму чуйныя, успрытнёныя, вочкі зыркія. Падушачкі, якія аздабляе сваёй вышыўкай майстрыха, свецяцца радасцю, цешаць вока каляровай разнастайнасцю... СТАР 3

Сёння адбудзецца першы паўфінал «Еўрабачання». Прадстаўніца Беларусі Алена Ланская з песняй «Solayoh» выйдзе на сцэну «Мальмё-Арэны» пад нумарам 11, які спявачка лічыць для сябе шчаслівым. СТАР 4

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

13 МАЯ 2013 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 86 (27451) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НОВЫ МЕХАНІЗМ ДЗЯРЖЗАКАЗУ НА БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ ДЛЯ ЛЬГОТНІКАЎ

У Беларусі ўводзіцца механізм дзяржзаказу на будаўніцтва жылля для катэгорый грамадзян, якія маюць права на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі. Адпаведны ўказ № 215 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні будаўніцтва (узвядзення, рэканструкцыі) жылых памяшканняў» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 8 мая, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

«Указам з 2013 года ўводзіцца новы механізм паляпшэння жыллёвых умоў для катэгорый грамадзян, якія маюць права на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі, — дзяржаўны заказ на будаўніцтва жылля», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Сутнасць дзяржаўнага заказу заключаецца ў тым, што на этапе будаўніцтва грамадзяне выключаны з інвестыцыйнага працэсу. Будаўніцтва жылых памяшканняў будзе ажыццяўляцца адзінымі дзяржаўнымі заказчыкамі (УКБ), а таксама іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі або арганізацыямі з доляй дзяржавы ў статутным фондзе 50 працэнтаў і больш па рашэнні гарадскога, раённага выканаўчага камітэта.

Названыя арганізацыі маюць права атрымліваць ільготныя крэдыты, што прадастаўляюцца ААТ «ААБ Беларусбанк» за кошт рэсурсаў, вызначаных Саветам Міністраў па ўзгадненні з банкам, у межах агульнага аб'ёму льготных крэдытаў, прадугледжаных на выкананне праграмы жыллёвага будаўніцтва на чарговы год. Працэнты за карыстанне льготнымі крэдытамі па дзяржаўным заказе ўстанаўліваюцца ў памеры 2 працэнтаў гадавых і выплачваюцца заказчыкамі штомесяц, пачынаючы з месяца, які ідзе за месяцам выдачы крэдыту.

Ільготны крэдыт па дзяржаўным заказе прадастаўляецца арганізацыі-заказчыку пры наяўнасці заключэння дзяржаўнай экспертызы праектнай дакументацыі, дазволу на правядзенне будаўніча-мантажных работ і дагавора будаўнічага падраду.

Максімальны памер такога льготнага крэдыту вызначаецца зыходзячы з каштарыснага кошту будаўніцтва жылога дома на дату пачатку выканання будаўніча-мантажных работ за вылічэннем затрат на падрыхтоўку праектнай дакументацыі.

Пагашэнне запазычанасці па льготных крэдытах, прадастаўленых заказчыкам, якія ажыццяўляюць будаўніцтва жылых дамоў па дзяржаўным заказе, будзе ажыццяўляцца пасля пераафармлення запазычанасці на грамадзян, уключаных у спісы на атрыманне льготных крэдытаў і заключыўшых крэдытныя дагаворы. Пераафармленне такой запазычанасці на грамадзян выконваецца пасля ўнясення імі ўласных сродкаў, у тым ліку сродкаў аднаразовых субсідый, вызначаных як рознасць паміж коштам жылога памяшкання па дагавору куплі-продажу і сумай ільготнага крэдыту, якая падлягае атрыманню ў адпаведнасці з крэдытным дагаворам.

Дзяржаўным заказчыкам (УКБ мясцовага выканаўчага і распарадчага органа) будуць перададзены ўсе звязаныя з будаўніцтвам фінансавыя і адміністрацыйныя рэсурсы, правы і адказнасць за планаванне, каардынацыю дзеянняў удзельнікаў інвестыцыйнага працэсу, тэрміны, якасць і кантроль кошту жылля.

Важнай перавагай механізму будаўніцтва жылля на аснове дзяржаўнага заказу стане скарачэнне тэрмінаў будаўніцтва і, як вынік, зніжэнне яго кошту, а таксама прадастаўленне грамадзянам гатовага жылля па цэнах на дату ўводу жылога дома ў эксплуатацыю.

Для будаўніцтва жылых памяшканняў па дзяржаўным заказе будуць выкарыстоўвацца праекты (серыі) эканамічных жылых дамоў тыпавых спажывецкіх якасцей, пералік якіх устанаўліваецца Мінбудархітэктуры.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СВЯТЫЯ СУСТРЭЧЫ, СВЕТЛЫЯ ЎСПАМІНЫ

Сустрэча жыхароў колішняй вёскі Даўляды Нараўлянскага раёна.

Працяг тэмы на 4-й стар.

ЦЫТАТА ДНЯ

Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы:

«Гістарычныя фільмы і кнігі пра вайну не заменяць жывых сустрэч, зносін з ветэранамі. У гэтыя майскія дні (не толькі 9 мая) ва ўсіх нас ёсць магчымасць сустрэцца з пераможцамі, выказаць ім словы ўдзячнасці і яшчэ раз даць сабе клятву быць годнымі іх ратных подзвігаў. Я не перастаю захапляцца мужнасцю дзядоў і прадзедаў, якія пад страхам знішчэння не здрадзілі сваім чалавечым каштоўнасцям. Менавіта на беларускай зямлі фашысты сустрэлі жорсткае супраціўленне. Беларусы аддалі некалькі мільёнаў жыццяў не толькі за сваю свабоду, але і за свабоду суседніх дзяржаў».

■ Соцыум

НЕ БЫЦЬ АДЗІНОКІМІ

Новыя формы сацабслугоўвання пажылых людзей укараняюцца ў краіне

Так, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, створаны новыя ўстановы, якія прадастаўляюць старым людзям сацыяльныя паслугі на стацыянарнай аснове, — дамы часовага сумеснага пражывання пажылых людзей.

Напрыклад, у «Дамах зімоўкі» двое-трое суседзяў пражываюць зімой у адным з дамоў, які ім належыць, дзе іх абслугоўвае сацыяльны работнік. Гэта эканамічна выгадная форма жыццеўладкавання пажылых людзей, якая не патрабуе дадатковых фінансавых выдаткаў, адзначылі ў міністэрстве.

Яшчэ адна новая форма — «Дамы самастойнага пражывання». Жылы дом, які пустуе ў сельскай мясцовасці, прыводзіцца ў нармальны тэхнічны стан, у яго засяляюцца непрацаздольныя людзі, якія не маюць жылля або якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. За імі, як правіла, ажыццяўляе патранат работнік тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, сельвыканкама, а пры неабходнасці да гэтай працы падключаюцца і іншыя службы раёна (праваахоўныя органы, медыцынскія ўстановы і г.д.).

«Гасцявая сям'я» прадугледжвае прыём на пражыванне ў сям'ю адзінокіх старых. Такія сем'і з гасцямі ўжо «прапісаліся», напрыклад, у Пухавіцкім, Старадарожскім, Маладзечанскім, Вілейскім раёнах Мінскай вобласці.

У «Прыёмнай сям'і» сацыяльны работнік бярэ да сябе на зімовы перыяд чалавека, якога абслугоўвае, для забеспячэння належнага яго догляду. Гэтая форма працы ўкараняецца ў Віцебскай вобласці.

Ствараецца для адзінокіх пажылых людзей і «патранатная сям'я». Заключаюцца трохбаковыя дамовы паміж карыстальнікам паслуг, сям'ёй, якая прадастаўляе паслугі, і тэрытарыяльным цэнтрам сацабслугоўвання на пражыванне і вядзенне сумеснай гаспадаркі ў сям'і з прынятым на пражыванне старым. Гэтая форма выкарыстоўваецца ў Вілейскім, Маладзечанскім раёнах.

«Дом самастойнага сумеснага знаходжання» ствараецца для пражывання адзінокіх састарэлых грамадзян і інвалідаў II і III груп, здольных да самаабслугоўвання і самастойнага пражывання, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю. Такая форма практыкуецца ў Смаргонскім раёне Гродзенскай вобласці.

У «Санаторыі на даму» адзінокім састарэлым грамадзянам на працягу 21 дня аказваюцца дома медыцынскія паслугі (масаж, фізіятэрапеўтычныя паслугі, дыетычнае харчаванне). Сацыяльны работнік на гэты перыяд абслугоўвае падапечных 5 разоў у тыдзень і гатуе для іх ежу, работнікі культуры арганізуюць міні-канцэрты, выезды бібліятэкараў і г.д. «Санаторыі на даму» адкрыты ў Вілейскім і Мядзельскім раёнах Мінскай вобласці.

Сёлета ў Мінску працягваецца пілотны праект па ўкараненні формы сацыяльнага абслугоўвання, заснаванай на рэнтавых адносінах. Дагавор пажыццёвага ўтрымання — гэта дагавор, па якім атрымальнік рэнты (грамадзянін) перадае жылое памяшканне, якое належыць яму, ва ўласнасць горада Мінска, а плацельшчык рэнты (Мінгарвыканкам) абавязваецца ажыццяўляць пажыццёвае ўтрыманне грамадзяніна. Дагавор пажыццёвага ўтрымання заключаецца з мінчанамі, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту і якія не маюць у сталіцы людзей, што абавязаныя па законе іх утрымліваць. Пажыццёвае ўтрыманне пенсіянер можа атрымліваць на даму і ў дамах-інтэрнатах. Ужо заключаны два дагаворы з жыхарамі Мінска (абслугоўванне ажыццяўляецца на даму і ў доме-інтэрнаце «Світанак»).

РАДАЎНІЦА Ў ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ЗОНЕ

У Магілёўскай вобласці могілкі, якія знаходзяцца на пацярпелых ад радыяцыі і адселеных тэрыторыях, можна сёння, 13 мая, і заўтра на Радаўніцу наведваць без спецыяльных пропускаў.

Такое рашэнне прыняла Адміністрацыя зон адчужэння і адсялення. Штогод шмат людзей прыязджае на месцы пахаванняў у чарнобыльскай зоне на дзень памінання памерлых. Прычым наведваюць перасяленцы не толькі могілкі, але і месцы, дзе былі, а цяпер пахаваны іх родныя вёскі і хаты.

Між тым, людзям, якія прыедуць на выселеныя тэрыторыі, нагадваюць таксама, што неабходна прытрымлівацца правілаў грамадскага парадку, пажарнай і радыяцыйнай бяспекі.

— У аўтамабілі трэба рухацца толькі па дазволеным маршруце, з належнай хуткасцю і без прыпынкаў, і зрабіць так, каб пыл не трапляў у салон, — пракаментаваў намеснік начальніка па Магілёўскай вобласці Адміністрацыі зон адчужэння і адсялення Алег Пімашкоў. — Нагадваю таксама, што паліць смецце забаронена.

Ілона ІВАНОВА.

■ Падзея

БЕЛАРУСКІ МІЖНАРОДНЫ МЕДЫЯФОРУМ ПРОЙДЗЕ 22—25 МАЯ

VIII Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства ў імя будучыні: гісторыка-культурная спадчына як фактар яднання» пройдзе 22—25 мая, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве інфармацыі Беларусі.

Чакаецца, што ў час адкрыцця медыяфоруму пройдзе сустрэча яго ўдзельнікаў з міністрам інфармацыі Алегам Праляскоўскім, міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем, старшынёй Мінгарвыканкама Мікалаем Ладуцькам. Пленарнае пасяджэнне форуму намечана на 23 мая ў гарадскім пасёлку Мір Гродзенскай вобласці. Сярод заяўленых у праграме медыяфоруму тэм — «Сродкі масавай інфармацыі: гістарычная місія ў захаванні і развіцці гісторыка-культурнай спадчыны», «Мова, нацыянальная літаратура як фактары суверэнітэту дзяржаў і яднання народаў».

Акрамя таго, на 24 мая запланаваны пасяджэнне журы X Міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» дзяржаў — удзельніц СНД, летняя школа журналістыкі.

Беларускі міжнародны медыяфорум традыцыйна выступае дыскусійнай пляцоўкай для абмену думкамі і выпрацоўкі новых ідэй і канцэпцый прадстаўнікамі экспертнай і медыясупольнасці краін СНД, блізкага і далёкага замежжа.

Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць Міністэрства інфармацыі Беларусі, Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы, Беларускі саюз журналістаў.

15 мая — «прамая лінія» «Звязды» па пытаннях вайсковай службы

На пытанні, звязаныя з парадкам прызыву і праходжаннем тэрміновай ваеннай службы, а таксама са зменамі, якія плануюцца ў будучыні, 15 мая з 16 да 17 гадзін адкажа **намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела прызыву галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, палкоўнік Андрэй Юр'евіч МУРАШОЎ**. Тэлефануйце ў гэты дзень па тэлефонах: **287 18 66, 287 18 71.** Задавайце свае пытанні загадзя па тэлефонах **287 19 42, 292 31 21** ці па электроннай пошце **info@zvyazda.minsk.by**. Вам адкажуць!

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НА ПАСАДУ ПРЭЗІДЭНТА ІРАНА ПРЭТЭНДУЮЦЬ АМАЛЬ 700 ЧАЛАВЕК

За пасаду прэзідэнта Ірана гатовы пазмагацца 686 чалавек. У краіне завяршыўся тэрмін рэгістрацыі ў кандыдаты на прэзідэнцкіх выбарах, паведамляюць інфармагенцтвы. Такім чынам, пабіты рэкорд мінулых выбараў, калі рэгістрацыю прайшлі 475 чалавек. Самаму маладому з цяперашніх кандыдатаў 19 гадоў, а самаму сталаму — 87. Тым не менш, канчатковы спіс кандыдатаў у прэзідэнты абвесцяць 22-24 мая пасля зацвярджэння Саветам вартавых Канстытуцыі — надпарламенцкім органам у Іране. Сярод зарэгістраваных кандыдатаў — былы прэзідэнт Алі Акбар Хашэмі Рафсанджані, а таксама галоўны перамоўшчык ад Ірана па пытаннях ядзернай праграмы Саід Джалілі. Лідар краіны Махмуд Ахмадзінежад не можа ўдзельнічаць у перадвыбарнай гонцы, паколькі ўжо правёў на гэтай пасадзе два тэрміны. Выбары пройдуць у Іране 14 чэрвеня.

У ФРАНЦЫІ ПАЦВЕРДЖАНЫ ДРУГІ ВЫПАДАК ЗАРАЖЭННЯ НОВЫМ КАРАНАВІРУСАМ

У Францыі пацверджаны другі выпадак заражэння чалавека новым каранавірусам, блізкім да цяжкага вострага рэспіраторнага сіндрому — атыповай пнеўманіі. Толькі за першы тыдзень мая ў свеце ад хваробы зарэгістравана 18 смяротных выпадкаў, з якіх 11 — у Саудаўскай Аравіі. Як распаўсюджваецца новая хвароба, пакуль незразумела. Другім інфіцыраваным аказаўся пацыент, што знаходзіўся ў бальніцы горада Валанса ў адной палаце з 65-гадовым мужчынам, які падхапіў небяспечную інфекцыю падчас паездкі ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. Раней Сусветная арганізацыя аховы здароўя пацвердзіла 34 выпадкі заражэння ў свеце новым вірусам. Акрамя Саудаўскай Аравіі, падобнае захворванне было выяўлена ў Іарданіі, Вялікабрытаніі і Германіі. Да гэтага часу СААЗ не мае дастатковых даных, каб зрабіць высновы пра спосабы распаўсюджвання новага віруса і прычыны яго ўзнікнення.

ПРЭЗІДЭНТ ЧЭХІІ З'ЯВІЎСЯ НА АФІЦЫЙНАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА НАПАДПІТКУ?

Прэзідэнту Чэхіі Мілашу Земану прыйшлося апраўдвацца за не зусім упэўненую хаду падчас наведвання музеяў Пражскага Града 9 мая. Прысутныя на мерапрыемстве журналісты адразу ж зрабілі выснову, што кіраўнік дзяржавы — п'яны: Земан прыкметна хістаўся, быў няўважлівы і надоўга закрываў вочы. Практычна адразу з'явілася пераканаўчая версія, дзе прэзідэнт мог выпіць лішку: незадоўга да наведвання музеяў Милаш Земан святкаваў Дзень Перамогі ў расійскім пасольстве. Прэс-сакратар канцыляры Пражскага Града Хана Бурыянава патлумачыла стан прэзідэнта дрэнным самаадчуваннем. Паводле яе слоў, прэзідэнт захварэў на ВРЗ.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КОЛЬКАСЦЬ АХВЯР ТЭРАКТАЎ У ТУРЦЫІ ДАСЯГНУЛА 46 ЧАЛАВЕК. ПАДАЗРОНЫЯ ЗАТРЫМАНЫ

Колькасць ахвяр тэрактаў у Турцыі, якія адбыліся 11 мая ў горадзе Рэйханлы, дасягнула 46 чалавек, паведамляюць інфармагенцтвы.

Два выбухі з інтэрвалам у 15 хвілін прагрымелі ў суботу каля будынка мэрыі і ў прамысловым раёне. Па папярэдніх даных, падарваліся два замініраваныя аўто. Больш за сто чалавек атрымалі раненні. Пакуль адказнасць за выбухі ніхто на сябе не бярэ. Улады Турцыі намякалі на магчымае дачыненне да тэрактаў сірыйскай разведкі. Аднак Дамаск абверг падобныя абвінавачванні.

Згодна з апошнімі паведамленнямі, паліцыя затрымала 9 чалавек па падазрэнні ў арганізацыі выбухаў. Віцэ-прэм'ер Турцыі Бесір Аталай паведаміў, што ўсе затрыманыя з'яўляюцца грамадзянамі Турцыі.

КОРАТКА

Інфляцыя ў Беларусі ў красавіку 2013 года склала 0,5 працэнта. Такім чынам, індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў красавіку 2013 года ў параўнанні з сакавіком склаў 100,5 працэнта, са снежнем 2012 года — 105,9 працэнта.

У Беларусі ў 2012 годзе сярэдні ўзрост нявесты, якая ўпершыню ўступала ў шлюб, склаў 24,6 года, жаніха — 26,7 года (у 2005 годзе ўпершыню бралі шлюб жанчыны ва ўзросце 23,5 года, мужчыны — у 25,7 года). З агульнай колькасці тых, хто ўступіў у шлюб летась, 74% мужчын і столькі ж жанчын упершыню зарэгістравалі шлюб, з іх 52,6% нявест і 41,2% жаніхоў упершыню пабраліся шлюбам у найбольш актыўным для яго ўзросце — у 20—24 гады. Амаль кожны чацвёрты зарэгістраваны ў 2012 годзе саюз быў паўторным як для мужчын, так і для жанчын.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.05.2013 г.

Долар ЗША	8660,00	▼
Еўра	11350,00	▼
Рас. руб.	278,50	▼
Укр. грыўня	1067,82	▼

ISSN 1990 - 763X

■ Тры пытанні да ўлады

НОВЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ — НОВЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ

Клецк — невялікі райцэнтр у Мінскай вобласці. Як правіла, лічыцца, што ў населеных пунктах такога кшталту не хапае працы, а людзі вымушаны шукаць яе ў буйных гарадах. Ці так гэта на самой справе? Куды могуць уладкавацца жыхары горада і раёна? Карэспандэнт «Звязды» спытала пра гэта ў старшыні райвыканкама Генадзя Салаўя.

— Клецкі раён спецыялізуецца на вытворчасці малака, мяса, збожжа, бульбы і цукровых буракоў. Разам з тым, у горадзе паспяхова развіваецца і прамысловасць, ствараюцца новыя вытворчасці. Сёння мы наладжваем выраб камплектуючых для вытворчых памяшканняў (вокны, дзверы), а на базе таварыства «Клецкі райаграсэрвіс» пачалі выпуск абсталявання для жывёлагадоўчых комплексаў раёна. Гэта вельмі важна, паколькі ў нас рэканструюцца старыя і будуюцца новыя фермы. Абсталяванне ўжо манціруецца на ферме племяннога завода «Чырвоная зорка». Цяпер будуем два новыя комплексы — на 600 галоў дойнага статка кожны. Плануем таксама дадаткова ўвесці ў эксплуатацыю дзве малочнатаварныя фермы пасля рэканструкцыі да пачатку мая.

Нядаўна на прадпрыемстве таварыства «Гама смаку» запусцілі вытворчасць бульбы ў тэрмічнай упакоўцы. Як паказалі першыя крокі, прадукцыя карыстаецца попытам у пакупнікоў. У філіяле Слуцкага сыраробнага камбіната «Клецкая крыначка» прадугледжваецца мадэрнізацыя з адкрыццём новай лініі па вытворчасці тварагу. Сёлета плануем рэканструкцыю таварыства «Рапс-Клецк», дзе будзе наладжаны выпуск дэзадараванага алею ў бутэльках. Вядзём мадэрнізацыю раённага камбіната бытавога абслугоўвання — тут пачалі выпуск мешкатары вялікіх ёмістасцяў. Акрамя таго, аб'яўлены тэндар на закупку абсталявання для новага цэха па шыцці пледаў і коўдраў. Гэтую прадукцыю клецкія бытавікі браліна рэалізацыю ў сваіх калег з Гродзенскай вобласці. Рэчы, выраблены на сучасным камп'ютарызаваным абсталяванні, павінны быць якаснымі і знайсці попыт.

— Новыя вытворчасці — новыя працоўныя месцы. Колькі іх з'явіцца ў раёне?

— Плануецца стварыць 30 рабочых месцаў. З другога боку, работы ў нас хапае для ўсіх: беспрацоўя няма. У цэнтры занятасці зарэгістравана 78 чалавек, але вакансій значна больш. Праўда, не ўсе пагаджаюцца на тую ці іншую работу. Кагосьці не задавальняюць умовы працы, іншага — заработная плата. Мы не бачым праблем з працаўладкаваннем ні мужчын, ні жанчын, паслугі якіх запатрабаваны на швейнай фабрыцы «Мальвіна», прадпрыемстве таварыства «Гама смаку», дзе выпускаюць дзіцячае харчаванне і сокі, «Клецкая крыначка» і іншыя.

— Наколькі ведаю, раён займае адно з апошніх месцаў па тавараабароце ў разліку на аднаго жыхара. Што робіцца для таго, каб людзі пакідалі грошы менавіта ў сваім рэгіёне, укладвалі іх у эканоміку свайго раёна?

— У нас у асноўным развіта сетка спажывецкай кааперацыі. Але, на маю думку, кааператарамі яшчэ не ўсё зроблена ў плане прыцягнення пакупніка. Тут патрэбны новыя падыходы, больш кемлівасці. У недалёкай перспектыве ў іх з'явяцца сур'ёзныя канкурэнты, якія прымусяць шукаць новыя шляхі да задавальнення патрэб кліентаў, напаўнення паліц крам самым шырокім асартыментам тавараў па прымальных цэнах. У адным з самых населеных мікрараёнаў Клецка плануецца адкрыць аптовы магазін «Алмі». Мы прапанавалі таксама інвестарам участак з усімі гатовымі камунікацыямі для будаўніцтва рынка. Магчыма, там будзе і невялікі лагістычны цэнтр. Думаю, што новыя гандлёвыя цэнтры будуць на карысць усім, а ў пакупнікоў з'явіцца альтэрнатыва. Але ў любым выпадку грошы застануцца ў рэгіёне і будуць працаваць, як вы заўважылі, на карысць эканомікі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Фота БЕЛТА.

12 мая ў Гродне каля манумента воінам-пагранічнікам, якія загінулі ў першыя дні вайны, прайшло ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае Дню Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

БЕЛАРУСЬ — УКРАІНА: СТРАТЭГІЯ ДОБРАСУСЕДСТВА

УНІКАЛЬНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІХ СТАСУНКАЎ ЗРАБІЎ ГІСТОРЫК ДЗЯНІС ЮРЧАК

Украіна — самая вялікая ўнутрыкантынентальная краіна Еўропы з насельніцтвам больш за 45 мільёнаў чалавек. Менавіта яна першай у свеце прызнала суверэнітэт Беларусі і ўстанавіла з нашай рэспублікай дыпламатычныя адносіны. Украіна першай сярод краін СНД адкрыла і сваё пасольства ў Беларусі. І, па сутнасці, Беларусь і Украіна сталі першымі дзяржавамі былога СССР, якія падпісалі паміж сабою дагавор аб дзяржаўнай мяжы — у 1997 годзе. Значэнне даследавання намесніка дэкана гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава Дзяніса Юрчака падкрэслівае і той факт, што яно выклікала цікавасць за межамі Беларусі.

Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з аўтарам і падчас размовы пачуў шмат цікавых фактаў.

— Манаграфія, аўтарам якой я з'яўляюся, мае назву «Беларусь — Украіна: 20 гадоў міждзяржаўных адносін». Мне прыемна, што ўступнае слова напісаў Віталь Уладзіміравіч Курашык, першы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь ва Украіне ў 1993—2001 гадах, які быў адным з першых чытачоў гэтай працы. Дарэчы, цікава, што ён стаў паслом Беларусі, хаця быў грамадзянінам Украіны. Пры гэтым яму было ад чаго адмаўляцца, бо да моманту свайго прызначэння на пасаду пасла Віталь Курашык узначальваў Савет Міністраў Крыма — а гэта вельмі «хлебнае месца». У дадатак ён быў яшчэ і дэпутатам Вярхоўнай Рады. Нягледзячы на гэта, прыняў прапанову Беларусі і ўзначаліў беларускае дыппрадстаўніцтва, бо быў ураджэнцам беларускай зямлі, а галоўнае — патрыётам. Ён адзіны з паслоў ва Украіне меў прамую сувязь з прэзідэнтам гэтай краіны, ведаў асабіста ўсю палітычную і эканамічную эліту нашай паўднёвай суседкі, што вельмі дапамагала ў працы.

— «Манаграфія Дзяніса Юрчака пра беларуска-ўкраінскія адносіны — гэта сур'ёзная навуковая праца, заснаваная на дакументах, фактах і шматлікіх публікацыях у СМІ. Аўтар аб'ектыўна і крытычна прааналізаваў вопыт супрацоўніцтва дзвюх суседніх суверэнных дзяржаў, што важна і каштоўна як для гісторыі, так і для будучыні», — так былы пасол напісаў пра вашу працу. А чаму вы асабіста зацікавіліся адносінамі Беларусі менавіта з Украінай?

— Мой бацька — украінец, нарадзіўся на Вінніншчыне. Таму гэтая тэма блізкая мне не толькі ў сувязі з работай над кнігай. І хаця сам я грамадзянін Беларусі, нарадзіўся непадалёк ад Расіі — на Лёзненшчыне, тым не менш ніякіх праблем з украінскай мовай і разуменнем рэалій Украіны ў мяне не ўзнікала.

— Пытанне дзяржаўнай мяжы — адно з ключавых у адносінах нашых краін. 1084 кіламетры — працягласць мяжы Беларусі з Украінай, яна другая па працягласці — пасля мяжы з Расіяй. Чытачам, напэўна, будзе цікава даведацца пра яе больш падрабязна, у тым ліку прачытаць аб тым, як Прэзідэнт Беларусі дазволіў украінцам збіраць ягады на нашай тэрыторыі.

— Гэта насамрэч унікальны выпадак у гісторыі міждзяржаўных адносін. Размова ідзе пра буйнейшы ў Еўропе Мэрлінскі палігон (ці як часта яго называюць — Мэрлін), дзе раней актыўна трэніраваліся савецкія лётчыкі і ракетчыкі. Падчас будаўніцтва палігона — у 1960-х гадах — нашых суграмадзян перасялілі ва Украіну з Беларусі. Адна з пераселеных вёсак называлася Мэрлінскія хутары — адсюль і пайшла такая незвычайная назва. Фармальна гэтыя людзі зараз маглі быць нашымі грамадзянамі. Але ўсё змянілася. На закінуты палігон з Беларусі патрапіць вельмі складана. Гэта забалочанае месца (у тым ліку вялікія балоты Гало і Чырвонае) і амаль поўная адсутнасць дарог.

Дзяніс Юрчак, намеснік дэкана гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава

І калі трапіць туды з Беларусі праблема, то з тэрыторыі Украіны — лёгка. Там шмат дзікарослых ягад — у сезон іх можна збіраць тонамі. Гэтым і займаюцца актыўна жыхары памежных сёл (колькасць жыхароў некаторых перавышае некалькі тысяч). Нашы памежнікі шмат разоў затрымлівалі ўкраінцаў, якія быццам бы выпадкова парушалі недэмаркіраваную на мясцовасці мяжу ў пошуках ягад. Былі прыклады, калі за дзень вярталі ва Украіну па 300 чалавек. Але гэта не стрымлівала зборшчыкаў ягад, бо мясцовым жыхарам часта такім чынам прыходзіцца зарабляць на жыццё ў небагатым прыгранічным раёне. У сувязі з тым, што з беларускага боку ягады там не збіраюць (з-за забалочанасці), жыхары памежных украінскіх вёсак у 2011 г. звярнуліся да нашага Прэзідэнта з просьбай неяк дапамагчы. І адбыўся ўнікальны факт: Аляксандр Лукашэнка дазволіў грамадзянам Украіны перасякаць мяжу — праз часовыя пункты пропуску, якія арганізуюцца падчас збору ягад. У тым жа годзе пагранічнікі дзвюх дзяржаў урэгулявалі сітуацыю праз падпісанне сумеснага пратакола, які вызначыў асаблівасці перамяшчэння мяжы для нашых былых суайчыннікаў падчас збору ягад.

— Гэта не адзінкавыя факты «выпадковага» пераходу мяжы жыхаroў памежжа?

— Граніца заўсёды прыцягвае тых, хто жадае зарабіць грошы на розніцы цэнаў у дзвюх дзяржавах і займаецца кантрабандай. Есць шмат прыкладаў незаконнай вырубкі лесу на беларускай тэрыторыі, рыбалоўства ў прыгранічных водах. Пэўны час кантрабандысты практыкавалі перагон свойскай жывёлы (як гаворыцца «сваім ходам»), бо ва Украіне можна было здаць мяса даражэй. Такі спосаб дазваляў прайсці ў месцах, дзе няма дарог, і ў выпадку затрымання пазбегнуць канфіскацыі аўтамабіля. Быў увогуле кур'ёзны выпадак, калі цэлы статак кароў з Беларусі «перайшоў мяжу» быццам бы з-за нецвярозага пастуха. Апошняе, праўда, выклікае сумненне. У выніку ўкраінскім пагранічнікам прыйшлося гнаць кароў некалькі дзясяткаў кіламетраў да бліжэйшага пункту пропуску і афармляць іх вяртанне дакументальна ў прысутнасці беларускіх прадстаўнікоў.

У пытанні законнага тавараабароту таксама бываюць праблемы, часам незразумелыя...

— Так, напрыклад, перыядычна ўводзіліся абмежаванні на ўвоз той ці іншай беларускай прадукцыі. У прыватнасці, сёлета ў чарговы раз вялася размова аб абмежаванні ўвозу ва Украіну нафтапрадуктаў з Беларусі. Для нас гэта вельмі балюча, бо фактычна кожны 5-ы долар, атрыманы Беларуссю ад перапрацоўкі нафты, — украінскі. Гэта значыць, што мы занялі вельмі значную частку рынку Украіны і кантралюем яго за кошт недарагога (на фоне ўкраінскага), але ў той жа час вельмі якаснага паліва, што ацаніў украінскі спажывец.

А ўкраінскія заводы, зразумела, спрабавалі лабіраваць свае інтарэсы. Але яны ў сваёй большасці не правялі мадэрнізацыю — працуюць на старых тэхналогіях. Мы ў гэтым пытанні на ўзровень вышэй. Атрымалася так, што лабісты тых украінскіх

Быў увогуле кур'ёзны выпадак, калі цэлы статак кароў з Беларусі «перайшоў мяжу» быццам бы з-за нецвярозага пастуха. Апошняе, праўда, выклікае сумненне.

нафтаперапрацоўшчыкаў спрабавалі праз урад правесці санкцыі, але катэгарычна супраць эканамічных абмежаванняў на беларускія нафтапрадукты выступіў прэм'ер Украіны Мікола Азараў. Ён разумее, што любое абмежаванне ў дачыненні да Беларусі — гэта адразу рост цэн на паліва ва Украіне. Гэта, безумоўна, ні ўраду, ні прэзідэнту Украіны не выгадна, бо цэны ў краіне і так на ўзроўні еўрапейскіх, а заробкі менш, чым у нас. Таму напрыканцы красавіка ў СМІ з'явілася аптымістычнае для нас паведамленне пра тое, што Украіна адмовілася ад сваіх прэтэнзій. Думаю, спрацаваў прагматычны падыход кіраўніцтва Украіны.

Калі пра тавараабарот у цэлым, то Украіна стабільна знаходзіцца ў тройцы нашых галоўных эканамічных партнёраў. У 2010 г. агульны тавараабарот паміж дзяржавамі складаў амаль 4,5 млрд долараў. І гэта было вялікае дасягненне для таго часу. Але пазітыўныя змены прасочваліся і надалей. У 2012 годзе мы ўжо мелі амаль 7,9 млрд долараў, прычым экспарт больш чым у два разы перавышаў імпарт. Акрамя таго, Украіна — член Сусветнай гандлёвай арганізацыі. І на гэтым рынку мы вымушаны канкураваць з усімі членамі арганізацыі. І тое, што мы там ёсць — добры паказчык.

З Беларусі адпраўляюцца ва Украіну прадукты харчавання, шыны, угнаенні, трактары, аўтамабілі, сельскагаспадарчая тэхніка. Есць прыклады паспяховых праектаў па арганізацыі зборачных прадпрыемстваў пад айчыннымі брэндамі на тэрыторыі Украіны. Створана развітая тавараправодная сетка і прадпрыемствы па тэхнічным абслугоўванні беларускай тэхнікі. Цікавы момант: у апошнія гады мы занялі свой сегмент на ўкраінскім рынку металаперапрацоўкі, хаця наша паўднёвая суседка сама з'яўляецца буйнейшым экспарцёрам металапрадукцыі. І масла, і малако, і каўбасы пастаўляем. Цукру ў 2010 годзе ажно на 66 мільёнаў долараў прадалі, а раней жа Украіна лічылася амаль што не манапалістам у пастаўцы цукру. Тым самым, Беларусь за апошнія гады здолела заняць сваю нішу на ўкраінскім рынку і пашырыць прысутнасць.

— Цікава, а як ва Украіне адносяцца да таго, што ў Беларусі будуецца АЭС?

— Я б сказаў, што спакойна. Украінцы нават дапамагаюць яе будаваць. Ва Украіне 5 уласных АЭС (з улікам Чарнобыльскай). Сярод іх — і Ровенская, размешчаная літаральна каля мяжы. Дарэчы, мала хто, напэўна, памятае, што ў 1990-х ва Украіне каля мяжы з Беларуссю планавалі будаваць магільнік для пахавання адпрацаванага ядзернага паліва. Але рэзкая пазіцыя Беларусі, у тым ліку актыўная дзейнасць нашых дыпламатаў на чале з Віталем Курашыкам, прывяла да адмовы ўкраінцаў ад сваіх планаў.

— У апошні час у СМІ і інтэрнэце з'явілася шмат супярэчлівых публікацый наконт магчымасці ўступлення Украіны ў Адзіную эканамічную прастору і Еўрапейскі саюз. Што можна сказаць па гэтым пытанні?

— Украіна, на мой погляд, палітычна зарыентавана на захад, але пры гэтым эканамічныя яе інтарэсы знаходзяцца ў першую чаргу на постсавецкай прасторы. Таму ад Адзінай эканамічнай прасторы Украіна хоча атрымаць эканамічныя прэферэнцыі (у першую чаргу ад Расіі), але не жадае падпісваць дакументы, якія быццам бы пагражаюць яе суверэнітэту. Калі паўстае пытанне аб палітычнай прывязцы да Расіі, украінская эліта адразу спрабуе ўтрымацца ад падпісання неабходных дакументаў. Таму ідзе размова толькі аб магчымай частковай ратыфікацыі Украінай дакументаў Мытнага саюза, супраць чаго катэгарычна выступае кіраўніцтва Расіі і іншыя удзельнікі Адзінай эканамічнай прасторы.

Цікава, што Украіна — адзіны член Саюза незалежных дзяржаў, якая не падпісала Статут СНД. Атрымліваецца, што краінай — заснавальніцай СНД, якая падпісала пагадненне аб стварэнні садружнасці, Статут так і не падпісаны.

Стратэгія ўступлення ў Еўрапейскі Саюз на Украіне распрацавана (яна падтрымана нават мясцовымі камуністамі), але Еўропа зараз не гатова прыняць Украіну, хаця і зацікаўлена прывязаць яе да сябе палітычна. Пры гэтым з Еўрасаюза ідзе ва Украіну немалое фінансаванне для рэалізацыі розных праектаў. У тым ліку грошы могуць быць патрачаны на дэмаркацыю беларуска-ўкраінскай мяжы. Еўропа хоча палітычна прыцягнуць Украіну, але баіцца эканамічных наступстваў, якія могуць балюча ўдарыць па еўрапейскіх падаткаплацельшчыках.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

БЕЛАРУСЬ НА РЭТРА-АЎТАМАБІЛЯХ

11-12 мая ў Беларусі прайшла патрыятычная акцыя «Квітней, Беларусь!» Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, прысвечаная Дню Дзяржаўнага герба і сцяга.

Фота БЕЛТА

Да ўрачыстага старту акцыі каля Мемарыяла «Стэла «Мінск — горад-Герой» далучыліся прадстаўнікі VI Міжнароднага злёту рэтра- і класічных аўтамабіляў «Рэтра-Мінск-2013» (усяго больш за 80 экіпажаў з розных краін).

Тэматычныя мерапрыемствы прайшлі ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі. У прыватнасці, ускладанне кветак да помнікаў і мемарыялаў воінскай славы, правядзенне канцэртаў, творчых фестываляў, конкурсаў патрыятычнай песні. Галоўная мэта акцыі, па словах арганізатараў, — умацаванне грамадзянскай пазіцыі, пачуцця патрыятызму, агульначалавечых каштоўнасцяў; фарміраванне ў моладзі любові да Радзімы, павагі да яе гісторыі, беражлівага стаўлення да дзяржаўнай сімволікі Беларусі.

Уладзіслаў СОЎПЕЛЬ.

НАТАРЫУСЫ ЎКАРАНЯЮЦЬ НОВЫЯ ФОРМЫ РАБОТЫ Ў АГРАГАРАДКАХ

Аб гэтым «Звяздзе» паведамілі ў Міністэрстве юстыцыі Беларусі.

Сярод новых формаў работы — абслугоўванне грамадзян на даму ў дзень выезду, правядзенне аналізу няскончаных спадчынных спраў і запрашэнне спадчыннікаў на бліжэйшы прыём, каб атрымаць пасведчанне аб праве на спадчыну.

Пераважная большасць жыхароў аграгарадкоў, адзначылі ў Міністэрстве юстыцыі, прыходзіць на прыём да натарыуса па пытаннях афармлення спадчынных правоў, а таксама, каб засведчыць завяшчанні і даверанасці.

У першым квартале 2013 года дзяржаўныя натарыусы ажыццявілі больш за 570 выездаў у 1422 аграгарадкі. Найбольш запатрабаваныя паслугі натарыусаў па выязным абслугоўванні сельскіх жыхароў у Брэсцкай, Мінскай і Гродзенскай абласцях.

Надзея ДРЫЛА.

ПА-ВОЛАТАЎСКУ

У гонар свята Перамогі ў Гродне прайшоў ужо традыцыйны міжнародны фестываль славянскага баявога майстэрства, які сабраў шмат «волатаўскіх» клубаў з Беларусі, Расіі, Украіны, а таксама прадстаўнікоў армейскіх і міліцэйскіх падраздзяленняў нашай краіны.

Браты-славяне спаборнічалі ў рукапашным і нажавым баі, гістарычным фехтаванні, прапанавалі шматлікім гледачам майстар-класы па стральбе з лука, вырабе рыцарскіх даспехаў. Акрамя таго, паказалі ўдаласць маладзецкую ў баі «сценка на сценку», коннай казацкай джыгітоўцы і рыцарскім бугурце.

А разам з сілай фізічнай — сіла духоўная. Знакавай падзеяй сёлетняга фестывалю стала ўрачыстая закладка каменя на месцы будаўніцтва капліцы ў гонар абраза Аўгустоўскай Божай Маці ў аграгарыстычным комплексе «Гарадзенскі мёнтак «Каробчыцы».

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СМАК САВЕТАЎ ПА-МУЖЧЫНСКУ

Апошнім часам беларускія вытворцы часта звяртаюцца па брэнды да гістарычнага мінулага. Прычым не асабліва далёкага. Савецкі час даў вельмі шмат гандлёвых марак, якія засталіся дагэтуль ва ўсіх на слыху. Сучасная моладзь з задавальненнем есць смачнае марозіва «савецкага гатунку», а тыя, хто пасталей, з асалодай успамінаюць сваю маладосць. Піўзавод «Аліварыя» вырашыў таксама ўскалыхнуць памяць тым, хто быў народжаны ў Савецкім Саюзе, і ў сярэдзіне мая выпусціць «Жыгулёўскае».

Дарэчы, гісторыя гэтага гатунку піва даўняя і, лічы, легендарная. Кажуць, што ў 1934 годзе наркам харчовай прамысловасці Анатас Мікаян наведваў Жыгулёўскі піўзавод у Самары і быў вельмі здзіўлены, чаму гэтае піва, што выпускае завод, мае такую «буржуазную» назву — «Венскае». Вытворцы былі кемлівыя і хуценька змянілі яе на «Жыгулёўскае». Ёсць і іншая версія: самарскае піва атрымала такую назву пасля таго, як перамагло на ўсесаюзным піваварным конкурсе «Лепшая савецкая марка піва». У Саюзе «Жыгулёўскае» было вядома, напэўна, кожнаму мужчыну. Аб гэтым сведчыць хаця б той факт, што на піку папулярнасці смачнае светлае піва варылі 735 заводаў па ўсёй краіне, у тым ліку і ў Беларусі».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

У БАРАНАВІЦКІМ РАЁНЕ АВАРЫЯ ЗАБРАЛА ТРЫ ЖЫЦЦІ

Тры чалавекі загінулі ў ДТЗ у выніку сутыкнення аўтамабіля з дрэвам каля в. Савічы (Баранавіцкі раён, Брэсцкая вобласць). Пра гэта БЕЛТА паведаміў дзяжурны УДАІ МУС Беларусі.

Аварыя адбылася 11 мая прыкладна ў 23.50. Малады чалавек (1993 года нараджэння), што знаходзіўся за рулём аўтамабіля «Фольксваген Вента», не змог выбраць бяспечную хуткасць руху, не справіўся з кіраваннем. Аўто выехала на левую па ходзе руху абочыну і ўрэзалася ў прыдарожнае дрэва. Пасля чаго адбылося ўзгаранне машыны. Кіроўца, а таксама пасажыры (1992 і 1995 гадоў нараджэння) загінулі на месцы. Па словах дзяжурнага, у вадзіцеля быў малы вопыт кіравання аўтамабілем (правы ён атрымаў у 2012 годзе).

■ На кантролі

ЗАЛІШНІЯ... СУБСІДЫІ

Камітэтам дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці выяўлена ўтойванне звышнарматыўных страт пры транспарціроўцы цеплавой энергіі ў сетках Мастоўскага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Гэтыя страты, якія па шасці кацельнях склалі амаль 520 Гкал на суму 217,8 мільёна рублёў, былі неабгрунтавана аднесены на сабекошт вытворчасці і рэалізацыі цеплавой энергіі. Адсюль — заніжэнне падаткаабкладаемай базы, а таксама залішнія субсідыі з раённага бюджэту на кампенсацыю страт ад рэалізацыі паслуг насельніцтву па ацяпленні і гарачым водазабеспячэнні па фіксаваных тарыфах на суму 138,2 мільёна рублёў. З улікам працэнтаў за незаконнае атрыманне бюджэтных сродкаў прадпрыемства вярнула 171,3 мільёна рублёў.

Нерацыянальна выкарыстоўваліся і бюджэтныя сродкі, выдзеленыя на набыццё ПІ-труб для замены зношаных участкаў цеплавой сеткі. У запланаваным аб'ёме гэтыя работы не выканалі. І ў той жа час зрабілі справаздачу, у тым ліку і ў дзяржстатыстыку, што заданні цалкам выкананы.

Узніклі пытанні ў кантралёраў і да бухгалтарскага ўліку працягласці цеплавых сетак, якасці правядзення іх леташняй інвентарызацыі. У выніку не ў поўным аб'ёме адлюстравана фактычная працягласць сетак. Адхіленне ад даных бухуліку склала ажно 41,5 кіламетра ў аднатрубным вылічэнні.

Камітэт дзяржкантролю Гродзенскай вобласці дасць адпаведную ацэнку гэтым і іншым парушэнням адміністрацыйнымі спагнаннямі. Акрамя таго, загадам па прадпрыемстве шасці вінаватым службовым асобам аб'яўлены вымовы.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ Погляд

СЦЯГ ЯК СІМВАЛ

У Беларусі ёсць 5 дзяржаўных святаў і толькі адно з іх не мае фіксаванай даты — Дзень Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. У 2013 годзе гэтае свята, якое адзначаюць у другую нядзелю мая, прыйшлося на 12-ы дзень месяца. Пазней (плануецца — у Дзень Незалежнасці) у Мінску будзе адкрыта Плошча Сцяга — архітэктурны комплекс, які ўключае Палац Незалежнасці, абноўлены выставачны комплекс і галоўны элемент — Дзяржаўны сцяг Беларусі, які будзе ўзвышацца на 70-метровым флагштоку, размешчаным у цэнтры плошчы. Стварэнне і адкрыццё гэтага комплексу на праспекце Пераможцаў стане, на думку кіраўніка дзяржавы, «апошняй буйной кропкай у спрэчках аб нашай незалежнасці».

Стварэнне падобных сімвалічных архітэктурных ансамбляў з'яўляецца агульнапрынятай практыкай у жыцці незалежных краін як постсавецкай прасторы, так і далёкага замежжа. Вялікія Плошчы Сцягаў ёсць у Азербайджане, Таджыкістане і Туркменістане. А сярод яркіх прыкладаў размяшчэння нацыянальных сцягаў на дамінуючых узвышэннях можна назваць сцяг Рагадан у Іарданіі, сцяг на плошчы Дэвіда Барклі ў Тэхасе, ЗША, брытанскі «Юніён Джэк» на Вестмінстэрскім абацтве ў Лондане...

Для Беларусі пытанне аб дзяржаўным сцягу мае асаблівае значэнне. Так склалася, што гістарычны бел-чырвона-белы сцяг стаў сімвалам апазіцыйнага руху і адмаўлення тых палажэнняў ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці, якія былі ўвасоблены ў новай Канстытуцыі краіны, а таксама ў сцягу і гербе, прынятых 14 мая 1995 года па выніках рэферэндуму. Бел-чырвона-белы сцяг стаў не інструментам барацьбы за паляпшэнне дзяржаўнага і грамадскага ладу, а сімвалам і інструментам іх адмаўлення і праз тое — адмаўлення самой навейшай беларускай дзяржаўнасці з яе акцэнтам на праваераемнасць у дачыненні да Савецкай Беларусі і да Вялікай Перамогі 1945 года. Бел-чырвона-белы сцяг, такім чынам, стаў сродкам заявы пра іншы праект беларускай дзяржаўнасці, праект, які адсылаў у першую чаргу да больш старажытнай Беларусі — гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Кволасць такога альтэрнатыўнага праекта была відавочнай. Спроба адмаўляць савецкі вопыт дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі, вопыт Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і падпісання Устава ААН, вопыт навукова-прамысловага развіцця і стварэння першакласных вытворчых прадпрыемстваў, вопыт паспяховага пераўтварэння беларускай культуры ў культуру сусветнага ўзроўню ў XX стагоддзі была загадзя асуджана на няўдачу. Бо, як трапна абазначыў Прэзідэнт Беларусі, усё, што стаіць за сучаснымі дзяржаўнымі сімваламі, — гэта «душа народа».

Але з іншага боку, грэблівае стаўленне да гісторыі нацыянальнага руху часткі ідэолагаў не дазвалялі і чырвона-зялёнаму сцягу стаць сімвалам адзінства беларускага народа.

Дык чаму цяпер ёсць нагода казаць аб «апошняй буйной кропцы» ў спрэчках аб незалежнасці Беларусі?

Перш за ўсё, адбылося пашырэнне афіцыйнай дзяржаўнай ідэалогіі, якая яшчэ асцярожна, але ўсё больш актыўна пачынае абапірацца на ўсю гісторыю краіны, а не толькі на яе савецкую частку.

Па-другое, больш выразнай стала пазіцыя беларускіх палітыкаў. Тыя, хто пад бел-чырвона-белымі сцягамі адмаўляў існуючай палітычнай сістэме і грамадскаму ладу ў праве на існаванне, хто абвінавачваў Аляксандра Лукашэнку ў «здачы суверэнітэту» Расіі, зараз у большасці сваёй абслугоўваюць інтарэсы найбольш агрэсіўна настроеных да нашай краіны колаў у Расіі. Для апраўдання такой пазіцыі выкарыстоўваюцца самыя неверагодныя тлумачэнні. Напрыклад: паколькі Расія інтэгруецца з Захадам, то паражэнне «рэжыму» з боку Масквы прывядзе да хутчэйшага набліжэння краіны да «Еўрапейскай Беларусі». Такому тлумачэнню пазайздросцілі б і бальшавікі ў свае лепшыя гады!

Зараз у палітычнай і сімвалічнай прасторы Беларусі няма праекта беларускай дзяржаўнасці больш моцнага, чым той, які стварыў і рэалізаваў Аляксандр Лукашэнка. І гэта — асноўная і дастатковая падстава для заявы аб «апошняй буйной кропцы».

І калі ставіцца гэтая кропка, становіцца зразумелым і тое, што, каб выжыць у цяжэйшых умовах глабальнага крызісу і дэстабілізацыі стратэгічнай сітуацыі ў Еўразіі, Беларусь павінна прыкласці намаганні, большыя за тыя, якіх нам каштавала Вялікая Перамога 68 гадоў таму. Новыя праекты дзеяння беларускай дзяржавы ў новых абставінах будуць выпрацоўвацца пад тым сцягам, які хутка ўздымецца над Мінскам на Плошчы Сцяга.

Юрый ЦАРЫК,
палітычны аналітык,
кіраўнік Беларускай групы развіцця

■ Сустрэчы

АД НЁМАНА ЗА ВЯЛІКІ КАМЕНЬ

Ужо за паўстагоддзя я на Беларусі жыву, працую і час ад часу падарожнічаю па свеце. І вось так склалася, што апынуўся ў сталіцы Заходне-Сібірскага рэгіёна Расіі па працоўных пытаннях. Пацікавіўся: мо тут ёсць людзі, звязаныя з Беларуссю? Ці, наадварот, уральцы, якія прысвяцілі сваё жыццё нашай зямлі?

У Екацярынбургскім аддзяленні беларускага пасольства сакратар адразу назвала мне імя Паўла Саенкі, намесніка кіраўніка культурнага згуртавання беларусаў Урала «БелУр» і аўтара кнігі «Беларусь і Расія: жывыя ніці роднасці» пра выдатных беларусаў Урала і ўральцаў Беларусі.

Праз некаторы час каржакаваты энергічны чалавек пенсійнага ўзросту моцна паціскаў мне руку. У кватэры — кнігі, кнігі, кнігі. Павел Андрэевіч запрасіў адразу на кухню, прапанаваў каву, і размова пацякла лёгка і натхнёна. Можна сказаць, цэлую кнігу пра беларусаў і ўральцаў распавядаў капітан першага рангу ў запасе, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры тэорыі дзяржавы і права Уральскай дзяржаўнай юрыдычнай акадэміі Павел Саенка.

Сам ён нарадзіўся на Магілёўшчыне ў першы год пасля вайны, у сям'і вайскоўца. З ваеннай службай звязаны ўвесь яго лёс. Пасля 28 гадоў службы — у адстаўцы, цяпер — пісьменнік. Каля дзясятка кніг выйшла з друку. Апошняя — «Беларусь і Расія: жывыя ніці роднасці». Сотні цікавых фактаў. Ад тых часоў, як пайшла Руская зямля, да сучасных дзён перакрыжоўваюцца лёсы двух народаў. Самыя найлепшыя дасягненні і ў рускіх, і ў беларусаў, і ў іншых народаў на неабсяжнай Еўразійскай прасторы былі, калі мы ўсе выступалі разам, калі былі ў адзінстве. Толькі адна Вялікая Айчынная пераважыць усе довады тых, хто імкнецца падзяліць нас.

Мы размаўлялі пра царскія роды Расіі, у якіх былі выхадцы з Беларусі (Алена Глінская і Кацярына II), і пра экспедыцыі Берынга... Так, у першай з іх удзельнічалі геадэзісты Іван Яўрэінаў і Фёдар Лужын, карані якіх у беларускіх землях. Яны даследавалі Камчатку і Курылы. А ў другой

— Вялікай Паўночнай экспедыцыі — беларусы па паходжанні былі сярод камандзіраў атрадаў. Так, начальнікам аднаго з іх, які прайшоў уздоўж Лены аж да Таймыра, быў Васіль Прончышчаў, родам з сям'і магілёўскіх шляхціцаў, якія перасяліліся ў Расію. У паходзе прымала ўдзел і яго жонка. Абое яны загінулі падчас экспедыцыі. Жонка Прончышчава была першай у Еўропе жанчынай — палярнай вандроўніцай.

Гаварылі мы з Паўлам Саенкам і пра сялян, якія тысячамі пераязджалі жыць за «Вялікі Камень», гэта значыць — за Урал, пасля адмены прыгоннага права ў 1861 годзе, у часы сталыпінскай рэформы і ў савецкі перыяд. Добраахвотна ці пад прымусам ішлі разам з іншымі народамі беларусы па бясконцых Сібірскіх шляхах і «лічылі бярозкі». Так казалі «неместачковыя» людзі. А «мястэчка» гэта — ад Урала да Ціхага Акіяна — Сібір-матухна завецца.

Успомнілі з Паўлам Андрэевічам і культурных дзеячаў, і вядомых спартсменаў. Уладзімір Мулявін з тагачаснага Свярдлоўска стаў Песняром Беларусі. Наталля Гайда, народная артыстка СССР і Беларусі, таксама нарадзілася ў Свярдлоўску. А вядомы трэнер «Уралачкі», жаночай валейбольнай каманды, якая была непераможнай у савецкія гады, — беларус Мікалай Карполь, родам з Пружанскага раёна. Першым ганаровым грамадзянінам Екацярынбурга стаў Іван Кажэўнікаў з Міншчыны. Ён узначальваў Екацярынбургскую кантору Дзяржаўнага банка Расіі напрыканцы XIX стагоддзя і шмат зрабіў для фінансавання і развіцця прамысловасці, заводаў і прадпрыемстваў Урала.

Пісьменнік нагадаў і пра Ганаровага консула Рэспублікі Беларусь у Цюмені Уладзіміра Шуглю, таксама нашага суайчынніка. Дзелавы чалавек, які піша вершы, песні і прыязджае ў Беларусь, каб выдаць сваю кнігу. Усё жыццё — у Расіі, а песні душы — на радзіме бацькоў.

Яшчэ і яшчэ гучалі імёны. Колькі даследаваных лёсаў, колькі часу спатрэбілася, каб сабраць матэрыял для кнігі, якая перакідвае масток сяброўства ад Нёмана за Вялікі Камень? Павел Андрэевіч і сам шмат падарожнічае. Старэнькі «Нікан» — яго верны сябар.

Я разглядаў фотаздымкі з яго службы, падарожжаў і разумеў, што нічога выпадковага не бывае ў жыцці. І гэтая сустрэча абавязкова будзе мець працяг...

Уладзімір ЛОБАЧ,
чытач і аўтар «Звязды»

■ Карані

ПРАЗ 100 ГАДОЎ...

Сенсацыяй можна назваць вяртанне работ Шагала ў родны Віцебск

У Віцебскім мастацкім музеі прадстаўлена выстава ў межах нацыянальнага турнэ арт-праекта «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі» — з калекцыі Белгазпрамбанка, музейных і прыватных збораў.

— З 7 мая да 30 ліпеня жыхары і госці горада над Дзвіной атрымаюць магчымасць на свае вочы ўбачыць карціны мастакоў — выхадцаў з Беларусі, чые працы вярнуліся ў нашу краіну праз 100 гадоў,— паведамілі ў Віцебскім мастацкім музеі. — Арт-праект, які стаў, на думку экспертнай супольнасці, падзеяй года ў культурным жыцці краіны, прыехаў у Віцебск у пашыраным, самым «зорным» складзе. Па-першае, у экспазіцыі будуць прадстаўлены лепшыя творы Марка Шагала: гэта не толькі карціна «Закаханыя», якая з'яўляецца адной з жамчужын карпаратыўнай калекцыі Белгазпрамбанка, але таксама жывапіс і графіка гэтага вялікага майстра. Па-другое, жыхары Віцебска ўбачаць яшчэ адну жамчужыну калекцыі — карціну Хаіма Суціна «Вялікія лугі ў Шартры», якая знаходзілася на рэстаўрацыі пасля экспазіцыі ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Па-трэцяе — і гэта стане сапраўдным сюрпрызам — у экспазіцыі будзе прадстаўлена новае імя. Упершыню ў Беларусі будзе дэманстравацца карціна Рыгора Глюкмана «Аголеная», якую зусім нядаўна банк набыў на аўкцыёне «Крысціс» у Лондане.

Дарэчы, у апошнія гады працы Рыгора Глюкмана карыстаюцца ўстойлівым попытам і пастаянна растуць у цане, перавысіўшы планку ў 300 тысяч фунтаў стэрлінгаў. Яго работы знаходзяцца ў многіх музеях, у прыватнасці, у Нацыянальным музеі сучаснага мастацтва, музеях Гаўра, Сан-Дыега і Чыкага, а таксама ў прыватных зборах ва ўсім свеце. Рыгор Глюкман нарадзіўся ў Віцебску, і вельмі сімвалічна, што першымі карціну гэтага самабытнага мастака ўбачаць на яго малой радзіме.

У творчасці Рыгора Глюкмана спалучыліся традыцыі рускага мастацтва і выдатнае веданне прыёмаў еўрапейскіх школ жывапісу. Як і старыя майстры, ён пісаў пераважна на драўляных дошках, карпатліва накладваючы адну фарбу паверх другой, каб ніжнія пласты прасвечвалі. Дзякуючы гэтаму Глюкман дамагаўся эфекту незвычайнай глыбіні і багацця адценняў...

Выставу «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі» ў Мінску наведалі больш за 50 тысяч чалавек. Яна мела настолькі шырокі рэзананс у грамадскім і культурным жыцці краіны, што арганізатарамі было прынята рашэнне прадоўжыць экспанаванне праекта ў абласных цэнтрах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Акцыя

Дрэвы Перамогі цяпер і ў Гомелі

У Гомелі акцыю «Пасадзі дрэва Перамогі» ў святочны дзень 9 Мая пачаў народны артыст Расіі Алег Газманаў. Ён, разам з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны ў гарадскім парку на набярэжнай Сожа, пасадзіў першыя шэсць рабін на будучай алеі Славы.

— Для кожнага чалавека і ў Расіі, і ў Беларусі — гэта святы дзень, — адзначыў спявак. — Гэта самая крывавая вайна, якая закранула кожную сям'ю. У мяне дзед прапаў без вестак. Мама і бацька выявалі. Бацька дайшоў да Берліна, а мама скончыла вайну на Халхін-Голе. Яны мала расказвалі пра вайну, таму што вайна — гэта кроў, бруд, смерць. Але Перамогу яны святкавалі заўсёды добра.

З мінулага года Алег Газманаў вывеў рух «Пасадзі дрэва Перамогі», пачаты яшчэ ў 1997 годзе, у гарады свайго гастрольнага графіка. Сёлета гэта Чалябінск, Гомель і Екацярынбург. Дарэчы, закладзеная алея Славы цяпер будзе шырыцца не толькі ў Дзень Перамогі, але і ў іншыя ўсенародныя святы — у дзень Незалежнасці Беларусі і ў дзень вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гэты ж дзень спявак, у чыім рэпертуары шмат твораў ваеннай і патрыятычнай тэматыкі, выступіў з канцэртам на гарадскім стадыёне Гомеля.

Зараз на тэрыторыі Гомельшчыны жывуць 4 тысячы ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Адна з самых важных задач органаў мясцовай улады — забяспечыць годнае жыццё кожнаму з іх. Гэта адзначыў на святочным прыёме ветэранаў старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік:

— Вы — гэта людзі, якія гартуюць наша грамадства, паказваючы на сваім прыкладзе, як трэба жыць, працаваць, любіць Радзіму. Вы здзейснілі агульны подзвіг, якія застанецца ў памяці чалавецтва на доўгія гады.

Галоўнымі ўдзельнікамі мерапрыемства сталі 39 ветэранаў, які прыехалі ў Гомель з розных куткоў вобласці. Унёсак кожнага з іх у справу Перамогі адзначаны шматлікімі ордэнамі і медалямі. Многія да гэтага часу вядуць актыўную грамадскую дзейнасць. Урачыстыя прыёмы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны прайшлі ў гарадскіх і раённых выканкамах. Іх ушаноўвалі на прадпрыемствах, у арганізацыях і ў школах па ўсёй Гомельскай вобласці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■ Простыя рэчы Сяргея Рублеўскага

ІМГНЕННІ, СКЛАДЗЕНЫЯ КРЫЖЫКАМ

Дзякаваць Богу, не пакруціў поліартрыт ручкі Лініі Радзівонаўны Зарэцкай. А магло б здарыцца. Доўгі час яна працавала даяркай: ледзяная вада, скразнякі... У той час даільных робатаў яшчэ не было.

Ручкі Лініі па-ранейшаму чуйныя, успрытнёныя, вочкі зыркія, так што ніткавы крыжык кладзецца на палатно акурат у адведзеным узорам месцы. Падушачкі, якія аздабляе сваёй вышыўкай майстрыха, свецяцца радасцю, цешаць вока каляровай разнастайнасцю так, што здаецца, на зямлі няма смутку.

Бываюць шчаслівыя дні, калі адну з такіх падушачак Лілія Радзівонаўна са сваіх Навасёлкаў, што на Пастаўшчыне, прысылае мне ў Віцебск. Цёплы вясёлкавы лапік на прарэху змаркочанай душы!

Майстрыха дорыць мне свае падушачкі з нагоды. А можна сказаць, у адказ: як толькі ў мяне выходзіць з друку кніжка, дык тут жа адсылаю яе на незабыўны адрас і чакаю з пошты абвестку на пасылачку ці тэлефоннага званка, калі Радзівонаўне выпадае перадаць адмыслова для мяне вышытую падушачку якім спадарожным чалавекам...

Лілія Радзівонаўна са сваімі творамі.

Аднойчы я расклаў яе падушачкі і пабачыў у радочку скразную нітачку сваёй душы: падушачка-«Апостраф», за ёй — падушачка-«Азярод», падушачка-«Абмытыя валуны» ну і далей па вешках выданняў. Маё літаратурнае аблічча, увасобленае каляровымі высілкамі майстрыхі. Без аніводнага прыкра-выпадковага вузельчыка ці несуладна падабранай ніткі! Такая своеасаблівая ўхвальная рэцэнзія на выдадзеныя кнігі, усё адно як адмыслова створаная для моднага цяпер ініцыятыўнага вылучэння на Нобелеўскую прэмію. Дарма што сонечная хвала ў тысячу столак перабольшаная.

Калі паглядзець на гэты вышываны літаратурны партрэт, дык можа здацца, што ў маёй душы няма ні цэню смутку, ні кропелькі горкай скрухі — толькі невыводная радасць жыцця. Майстрысе хочацца, каб так і было на самой справе.

Лілія Радзівонаўна з нагоды і без яе, проста каб не змарнавалася натхненне, ужо аздобіла сваёй вясёлкавай вышыўкай звыш паўтары сотні падушачак. І ўсе раздарыла — па грудку каляровага сну пад шчаслівую шчаку. Найперш — сваім дзецям і ўнукам, а тады — добрым сябрам ды знаёмцам, сусядзям ды гасцям. Дзяцей у яе пяць — чатыры дачкі і сынок, унукаў — дзевяць, сяброў і зычлівых прыхільнікаў — незлічона.

Год таму, калі я забраў у горад дажываць свой век зусім старэнькую матулю, да маіх падушачак нечакана вярнуліся іх першароднасць, натуральнае прызначэнне. Мама дужа ўпадабала па-старадаўняму застаўляць імі засцелены ложак. І тады ў вясёлкавай прыўкрасе я пачаў зусім не пазнаваць свае кніжкі. Як быццам і не было іх ніколі, гэтага плёну прыкрай забаўкі сялянскага мальца. Мяне пачало ўсцешваць тое, што наша з Ліляй Радзівонаўнай прыдумка абменьвацца творамі так шчодра ўлагодзіла матчыну душу.

Зайду, бывае, у яе пакойчык, зірну на каляровы радочак і думаю: «А мусіць жа, мае падушачкі паспрыялі маці хоць разок згадаць маладыя гадочкі, калі і сама яна вышывала крыжыкам ручнікі ды даматканыя посцілкі... Не так таленавіта і пераканаўча, як Лілія Радзівонаўна, а ўсё ж...».

Як шмат чаго на гэтым свеце звязваюць ніткі! А прыгажосць, як чырвоная нітка, сшывае ў суцэльны ахоўны покрыў лапікі душ усіх неабыякавых, чуйных сэрцам людзей.

У дзівосны суплёт заплялі мае думкі і пачуцці падушачкі Лініі Радзівонаўны. Калі маму, як мне здаецца, яны вяртаюць у маладосць, дык мяне змусілі падумаць аб смерці. Нечакана вершык згадаўся, напісаны паўжыцця таму:

Не бачыў такі я ніколі
Агністы праменісты колер,
Валошка, лісточак зялёны —
На белым, як воблака, лёне.
Гармоніі велічных ліній
Не месца ў выцвілай скрыні.
— Аддайце сукенку музею, —
Прасіў я бабулю Надзею.
Ды так мне яна адказала:
— Дзяўчынай яе вышывала,
Весняй шчаслівай гадзінаю,
Каб спадабацца адзінаму.
Сёння вось морак асенні ў акне,
Хутка зямліца мяне прыгарне.
Не век нам спяваці, спяваці...
Пайду свайго дзеда шукаці.
У гэтай сукенцы, я знаю,
Мяне ён адразу пазнае.

Падораныя падушачкі.

Калі памру, думаю сабе, загадаю блізкім абкласці мяне ў труне падушачкамі-вышыванкамі. Незвычныя будуць хаўтуры — насуперак усімі прынятай завядзёнцы, але не скажаш, што насуперак маці-прыродзе: колькі заўгодна ў яе настылых камянёў у акружэнні веснавой квецені...

Сябры мае, уражаныя трохі прыкрым відовішчам, не змогуць даць поўную волю свайму смутку. Гэта вельмі добра, тым больш, што я тады пра іх думаць ужо не буду...

На сваім чоўне без ветразя я буду пакрысе адплываць у вечнасць з затоеным у застыглай свядомасці спадзяваннем, што на тым свеце па падушачках мяне спазнаюць браты-беларусы, нават тыя дзяды і бабулі, якія не ўмелі чытаць.

■ Факт

Без плэй-оф

Зборная Беларусі страціла шанцы трапіць у накаўт-раўнд чэмпіянату свету па хакеі, які сёлета праходзіць у Швецыі і Фінляндыі.

Матч з нарвежцамі ў Стакгольме для нашай каманды быў важным. Менавіта перамога над скандынавамі магла дапамагчы хлопцам Андрэя Скабелкі паправіць турнірнае становішча, паверыць у тое, што і ў плэй-оф трапіць цалкам верагодна. Шкада, але так не адбылося. Пасля паражэння ад Канады (1:4) суайчыннікі не справіліся з далёка не самым моцным сапернікам — 1:3. Лік у гэтым паядынку мог быць «сухі», аднак Аляксандр Кулакоў усё ж такі перайграў Ларса Хаўгена, між іншым, варатара мінскага «Дынама». Што казаць, апошнія сустрэчы супраць зборных Даніі (13 мая) і Швейцарыі (14 мая) і для нас у турнірнай сетцы амаль нічога не азначаюць, аднак, як сказаў Андрэй Скабелка, каманда змагаецца за гонар краіны і ў гульнях з гэтымі зборнымі трэба паспрабаваць крыху паправіць становішча.

Тарас ШЧЫРЫ.

Зацверджаны пералік платных дарог

Платнымі ў нашай краіне хутка стануць 815 кіламетраў дарог.

Урад краіны пастанавіў № 340 ад 30 красавіка вызначыў пералік дарог, на якіх з 1 ліпеня будуць браць плату за праезд транспартных сродкаў праз адпаведную электронную сістэму.

Калі гаварыць пра самі дарогі, дык платнымі з названай даты стануць аўтамагістраль М-1/Е30 Брэст (Казловічы) — Мінск — граніца Расіі (Рэдзькі) на ўсім працягу, а таксама асобныя ўчасткі аўтамабільных трас М-2 Мінск — Нацыянальны аэрапорт Мінск, М-3 Мінск — Віцебск, М-4 Мінск — Магілёў, М-5/Е271 Мінск — Гомель і М-6/Е-28 Мінск — Гродна — граніца Польшчы (Брузгі). Памер платы за праезд ужо ўстаноўлены. Яна вагаецца ў залежнасці ад дапушчальнай агульнай масы транспартнага сродку і колькасці восяў і складае ад 0,04 да 0,12 еўра за адзін кіламетр.

Сяргей РАСОЛЬКА

Навінкі са смеццевага кошыка

Падчас выступлення.

З касметычных флаконаў — казачныя героі, з пластмасавых бутэлек — шторы, лілеі з аднаразовых лыжак, чарот з упаковак аптэчных лекаў... Чаго толькі не пабачыш у дзіцячым садку «Светлячок»! Дзяўчынкі і хлопчыкі з выхавацелямі і бацькамі зараз актыўна ўдзельнічаюць у экалагічным праекце «Навінкі са смеццевага кошыка». З непатрэбных рэчаў (напрыклад, скрынак, коркаў ды цэлафанавых пакетаў) вырабляюць сувеніры. І не толькі сувеніры, а нават і касцюмы! Са старога парасона атрымалася цудоўная сукенка, вечкі з-пад дзіцячага харчавання ператварыліся ў рыцарскія даспехі. На экалагічным свяце выхаванцы старэйшай групы прадставілі сем незвычайных, не падобных адзін да аднаго строяў. Свята — лагічнае завяршэнне экалагічнага тыдня, які прысвяцілі Году беражлівасці. Але ў садку ніколі не забываюць пра прыроду. Дзеткі з задавальненнем вырошчваюць на вокнах у групах кветкі і расаду, праводзяць экалагічныя віктарыны, вучаць назвы дрэў. Разам з бацькамі ходзяць на суботнікі, майструюць шпакоўні. І памятаюць: «Чыста там, дзе не смецяць».

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.
Аграгарадок Міханавічы.

Касцюмы з непатрэбных рэчаў.

Усходні гараскоп на тыдзень

АВЕН. З'явяцца задумы новых праектаў, жаданне і магчымасць іх ажыццявіць — толькі не забывайце пра разумную асцярожнасць. Каб умацаваць бюджэт і пашырыць кругагляд, бярыце ўдзел у сур'ёзных камерцыйных праектах. Вучыцеся новаму, узбагачайцеся карыснымі сувязямі. Паспрабуйце прыйсці да адзінага меркавання з блізкімі людзьмі.

ЦЯЛЕЦ. Даведаецеся шмат новага ў сваю працу. Паспрабуйце не мяняць нічога вакол, перачакайце буру, якая насоўваецца, інакш сваёй рэакцыяй на гэтыя падзеі вы можаце проста напалохаць калег. Стан нявызначанасці працягнецца некалькі дзён. Але пакуль не наступіла яснасць, не прымайце нічый бок.

БЛІЗНЯТЫ. Тыдзень яркі, насычаны падзеямі і сустрэчамі. Пры жаданні вы будзеце моцнымі і непахіснымі, а ваша працаздольнасць значна павялічыцца. Тыдзень добры для пачатку далёкіх паездак і для сустрэчы з тымі, хто прыехаў здалёк. Паспрабуйце не казаць шмат лішняга, каб не шкадаваць пра гэта пасля.

РАК. Неабходна ўсё прадумаць і сур'ёзна падрыхтавацца да рашучага кідка наперад. Вярніцеся да старых памылак, прааналізуйце іх і зрабіце неабходныя высновы. Паспрабуйце ўціхамірыць сваю ганарыстасць, прыслухацца і пачуць патрабаванні кіраўніцтва, і тады службовыя справы пойдуць на лад. Неабходна навучыцца ўпісвацца ў часавыя рамкі, выключыце спазненні. Можа запатрабавацца шпаркасць рэакцыі ў прыняцці рашэнняў.

ЛЕЎ. Актыўнасць будзе некалькі абмежавана па аб'ектыўных прычынах. Не плывіце супраць плыні, заставайцеся часова на другіх ролях — менавіта такая тактыка можа прывесці да найлепшага выніку. Будзьце асцярожныя: верагодна паступленне наўмысна скажонай інфармацыі, а таксама ўзрастае актыўнасць нядобразычліўцаў і канкурэнтаў.

ДЗЕВА. Будзеце спакойныя, настрой — выдатны. Атрымлівайце асалоду ад жыцця, новых прыемных знаёмстваў, зносін. Поспех на працы шмат у чым залежыць ад рашучасці і арганізатарскіх здольнасцяў. Апроч працы, не забывайцеся пра дом і назапашаныя побытавыя праблемы.

ШАЛІ. Паспрабуйце ў бліжэйшыя дні сабрацца з духам і скончыць усе справы, якія надакучылі. Магчымыя дробныя непрыемнасці на працы, якія не варта прымаць блізка да сэрца. Пазбягайце шумных кампаній, ад запрашэння на вечарынку лепш наогул адмовіцца. Многія знаёмыя пажадаюць верх дыпламатычнага майстэрства, каб ніхто не пакрыўдзіўся.

СКАРПІЁН. Спяшайцеся, пакуль Фартуна захоўвае добразычлівасць да вас. Ні ў якім разе не варта сядзець склаўшы рукі. Вы павінны вельмі многае паспець, таму не варта марнаваць гэты залаты час. Паспрабуйце не перанапружвацца на працы, інакш назапашаную стомленасць можаце выліць на сваякоў ці сяброў.

СТРАЛЕЦ. Паспрабуйце не прымаць паспешлівых рашэнняў. Можа адчувацца напружанасць адносін у дзелавой сферы. З аднаго боку, варта асцерагацца падману, а з іншага — канфліктаў з начальствам і калегамі па працы.

КАЗЯРОГ. Шматлікія жыццёвыя пытанні будуць вырашацца спакойна і без напружання. Атмасфера вакол гарманізуецца і прынясе запакаенне. Можаце распачаць нешта экстравагантнае ў рамках працоўнага працэсу. Неабходна старанна правяраць інфармацыю, якая паступае, каб пазбегнуць памылак і скажэнняў. Можаце разлічваць на дапамогу і падтрымку сяброў, калі яна вам спатрэбіцца.

ВАДАЛЕЙ. Усе кантакты тыдня павінны быць падпарадкаваны інтарэсам справы. Выкарыстоўвайце камунікабельнасць і інтуіцыю, давярайце свайму нюху. У пятніцу перш чым штосьці рабіць, неабходна ўсё прадумаць да дробязяў. Яна можа аказацца самым складаным і насычаным днём тыдня. У выхадныя паездка на прыроду дапаможа папоўніць энергію і сілы.

РЫБЫ. Верагодны прафесійны ўзлёт і поспех. Набалелыя праблемы на працы вырашацца спакойна, нават з некаторай лёгкасцю. Кансерватыўнае стаўленне да жыцця і планамернасць дзеянняў паспрыяюць атрыманню дапамогі, у тым ліку фінансавай, ад тых, хто старэйшы ці вышэй па статусе. Абапірайцеся на свой досвед, здольнасць пралічыць падзеі і прыняць стратэгічна правільнае рашэнне.

■ Рэгіён

Магілёў у фантанах

Ад сяўбы на палетках — да ахаладжэння ў фантанах. Працяглыя выхадныя дні людзі скарысталі для адпачынку і гаспадарчых спраў.

У гэтыя святочныя дні многія жыхары Магілёва адправіліся ў вёскі і на лецішчы для ўласнай пасяўной кампаніі. У горадзе адразу паменела людзей і аўтамабіляў. Тыя, хто застаўся, прыбіралі могілкі да дня памінання памерлых, саджалі кветкі ў дварах і на балконах, адпачывалі.

У абласным цэнтры распачаўся сезон летніх забаў. Актыўна працуюць дзіцячыя атракцыёны і адкрытыя кавярні, увечары на пешаходнай вуліцы Ленінскай ездзіць турыстычны цягнік і шпацыруе модна апранутая публіка.

Аматары адпачынку на прыродзе запаланілі Пячэрскі лесапарк, дзе можна схавацца ў цені ад амаль што летняй спякоты. Падчас пікнікоў некаторыя нават спрабавалі адкрыць уласны купальны сезон раней, чым звычайна, аднак Магілёўскае таварыства ратавання на вадзе настойліва рэкамендавала гэтага не рабіць. Паводле слоў спецыялістаў, тэмпература вады дасягае 12 градусаў цяпла, і зараз ад адчувальнай розніцы тэмператур паветра і вады ў купальшчыкаў можа спыніцца кровазварот, таму купанне пакуль забараняецца. Між тым, магілёўскія падлеткі знайшлі спосаб ахаладжэння ў самым цэнтры горада: яны пырскаюцца вадой каля фантанаў на вуліцы Першамайскай, а некаторыя проста ў адзенні акунаюцца ў прахалодную ваду. Такія вясёлыя водныя забавы становяцца сапраўдным шоу для публікі.

Ілона ІВАНОВА

■ Народныя мудраслоўі

«ПЕРШ ЧЫМ САБЕ — ПРОДКАМ!»

Усходнеславянская традыцыйная карціна свету (міфалагічная, дакладней, міфапаэтычная мадэль свету) была пабудавана наступным чынам. Неба прыналежала багам (пантэону вярхоўных богаў) і вярхоўнаму богу-ўседзяржыцелю. Гарызонт зямлі належаў чалавеку і яго спадарожнікам — духам прыроды (палявік, дамавік, лясун). Падземны (хтанічны) свет — гэта свет нашых продкаў, менавіта яны лічыліся сапраўднымі гаспадарамі зямлі. Ад іх добразычлівасці залежаў ураджай, а значыць, і дабрабыт сям'і. Відавочна, таму ў календары беларусаў значнае месца адводзіцца абрадавым дзеянням, накіраваным на ўшанаванне продкаў. Практычна кожнае свята гадавога цыклу, а таксама абрады сямейна-родавай накіраванасці ў сваёй структуры мелі абавязковы складнік — момант ушанавання продкаў. Часцей за ўсё, каб увекавечыць памяць пра сваіх бацькоў, дзецям у сям'і даваліся імёны ў гонар бабуль і дзядуляў.

Нельга не адзначыць адну вельмі выразную асаблівасць. Пераважная большасць свят з'арыентавана на дыялог чалавека з Прыродай, з Космасам, а асноўны сэнс гэтага дыялогу — заручыцца падтрымкай сіл прыроды, каб яны актыўна і эфектыўна паспрыялі вялікаму, складанаму і працягламу па часе цыклу сельскагаспадарчых работ. Аднак нельга не заўважыць, што ў гэты **адладжаны рытм земляробчых спраў уключаны два святы,** характар якіх прынцыпова адрозніваецца ад усіх астатніх. Гэта ***Радаўніца і Восеньскія Дзяды.*** Гэтыя дні ўшанавання продкаў фіксавалі сімвалічную «мяжу» пачатку і заканчэння найважнейшых аграрна-каляндарных святкаванняў.

Ушанаванне продкаў стала своеасаблівым сувязным звяном паміж паляпшэннем дабрабыту і захаваннем свайго роду, адным з самых галоўных прынцыпаў не толькі кожнага рытуальна-абрадавага комплексу, але і календара ў цэлым. У якасці ілюстрацыі прывядзем некалькі прыкладаў:

1. Сярод беларусаў і сёння шырока бытуе прыказка *«Першы блін камяком»*, сэнс якой у другой палове XX ст. пачалі тлумачыць наступным чынам: адсутнасць вопыту часта прыводзіць да таго, што задуманае не ўдаецца цалкам здзейсніць.

Аднак шматлікія абрадавыя кантэксты дазваляюць даць зусім іншую інтэрпрэтацыю зместу прыказкі. У асяроддзі беларусаў існаваў звычай: на кожнае вялікае свята ў сям'і абавязкова пяклі бліны (ячныя, пшанічныя, бульбяныя, жытнія, грэцкія), але **першы спечаны блін** (у адпаведнасці з патрабаваннем этыкетна-нарматыўнага прадпісання) клалі на сподак і ставілі пад абразы або на падаконнік, таму што ён **прызначаўся душам памерлых продкаў.** Тры дні ляжаў гэты блін на самым пачэсным месцы, затым яго аддавалі птушкам, якія, паляцеўшы на поўдзень — у «вырай» — перададуць прывітанне памерлым родным. А калі хто-небудзь парушаў прадпісанне звычаёвага права і спрабаваў сам з'есці блін, то ён (блін) якраз і «станавіўся коламі». Кантэкст фразеалагізма «колам стаў» аналагічны папярэдняй прыказцы. З апісанняў усходнеславянскіх этнографаў вядома, што «ведзьмакоў» або самагубцаў (людзей, якія парушылі свяшчэнны запавет *«Бог даў, Бог і ўзяў»*) хавалі асобна, па-за могілкамі, а над магілай ставілі адпаведны знак парушэння — не крыж, а асінавы кол.

2. Усе ўдзельнікі жалобнага стала таксама падпарадкоўваліся найважнейшаму прынцыпу *«перш чым сабе — продкам»*, г. зн. **першую чарку налівалі памерламу;** абсалютна кожная страва, якая пададзена на стол, павінна быць патрошкі адкладзена яму ў талерку.

3. На ўсёй Беларусі да сённяшняга дня жанчыны, у якіх памерлі малыя дзеці, прытрымліваюцца забароны ўжываць яблыкі новага ўраджаю да Яблычнага Спаса. Хрысціянская легенда сведчыць, што ў гэты дзень Бог адорвае памерлых дзяцей рознымі пачастункамі, сярод якіх ёсць і яблыкі. Калі ж чыя-небудзь маці не ўтрымалася і з'ела яблык да Спаса, то лічылася, што дзіця на «тым» свеце застанецца без падарунка. Таму бацькі, у якіх памерлі дзеткі, **першыя яблыкі новага ўраджаю на Спаса асвячалі ў храме і неслі на іх магілы.**

4. На *Саракі* гаспадыні выпякалі **печыва ў выглядзе птушачак** — «жаваранкаў», «чырачак» (так называюць печыва ў в. Тонеж Лельчыцкага раёна). Перш, чым есці самім і прапаноўваць дзецям, якія з гэтымі «птушкамі» гукалі вясну, адну з іх тут жа **кідалі назад у печ — прыносілі ахвяру продкам свайго роду.**

5. У ранейшыя часы існаваў звычай: **маладыя адразу пасля вянчання выходзілі з храма і ішлі да магіл сваіх продкаў,** таму што могілкі былі тут жа, побач з храмам. Ад сучаснага месца рэгістрацыі шлюбу — загса — да бацькоўскіх могілак далёка. Аднак у памяці людзей усё роўна захаваўся прынцып: перш, чым маладыя паедуць да вясельнага стала, яны абавязкова павінны накіравацца да брацкіх магіл або іншых рытуальных мясцін, звязаных з ушанаваннем загінулых або памерлых і **схіліць галаву — пакланіцца продкам.**

6. Нагадаем яшчэ адно даволі жорсткае папярэджанне, шырока вядомае сярод старэйшых людзей: *«Не чапай зямлю да Радаўніцы або да Дабравешчання!»* Прыходзіла вясна. Чалавек рыхтаваўся да пачатку вялікага цыкла сельскагаспадарчых работ. Аднак традыцыйны светапогляд дыктаваў: **перш, чым наводзіць парадак на сваім прысядзібным участку, навядзі парадак на магілах сваіх продкаў.** Тая ж жыццёвая логіка падказвала: калі на *Радаўніцу* вы заручыліся падтрымкай сваіх продкаў, а на *Багача* парадаваліся сабранаму багатаму ўраджаю, то на *восеньскія Дзяды* неабходна аддзячыць продкам за дапамогу і падзяліцца з імі набытым багаццем.

Менавіта таму забаранялася ставіць помнікі на магілах пасля *Пакравоў* (калі зямля засынае) і да *Радаўніцы*.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК

ШОУ ПАЧЫНАЕЦЦА!

Сёння ўвечары адбудзецца першы паўфінал 58-га міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне». Прадстаўніца Беларусі Алена Ланская з песняй «Solayoh» выйдзе на сцэну «Мальмё-Арэны» пад нумарам 11, які сама спявачка лічыць для сябе шчаслівым.

Дарэчы, якраз 11 мая ў Мальмё прайшла беларуская вечарынка, дзе былі прэзентаваны ажно 6 рэміксаў конкурснай песні Алены, а таксама гучалі песні беларускіх удзельнікаў «Еўрабачання» мінулых гадоў. Планавалася, што ганаровым госцем вечарынкі стане нарвежац беларускага паходжання, пераможца «Еўрабачання-2009» Аляксандр Рыбак, але з-за хваробы артыст вымушаны быў прапусціць гэтую падзею. Тым не менш, цёплыя пажаданні і словы падтрымкі спявачцы ён перадаў.

Артыстка і яе каманда колькасцю амаль у 30 чалавек лічаць, што падрыхтаваліся да гэтага выступлення настолькі добра, наколькі ўвогуле былі здольныя. «Калі першай рэпетыцыяй мы былі задаволены працэнтаў на 70 (у нас узніклі пытанні па гуку і здымках нумара), то пад канец другой рэпетыцыі нумар выглядаў амаль на ўсе 100, — расказаў прадзюсар спявачкі Дзмітрый Баранаў. — Спадзяюся, што 14 мая хваляванне не падвядзе і атрымаецца як мінімум не горш».

Нагадаем, у адным паўфінале з беларускай удзельніцай спаборнічаць за пуцёўкі ў фінал будуць прадстаўнікі Аўстрыі, Бельгіі, Галандыі, Даніі, Ірландыі, Кіпра, Літвы, Малдовы, Расіі, Сербіі, Славеніі, Украіны, Харватыі, Чарнагорыі і Эстоніі. Трансліруюць першы паўфінал і галасуюць у ім, акрамя пералічаных, удзельнікі «вялікай пяцёркі» арганізатараў Вялікабрытанія і Італія і пераможца мінулага года Швецыя. Гледачам і суддзям менавіта з гэтых краін канкурсантам трэба спадабацца настолькі, каб трапіць у выніку ў першую шчаслівую дзясятку фіналістаў.

Чым уразім

На сцэну Алена Ланская выйдзе з вялізнага бліскучага дыскабола — гэты шар якраз і сімвалізуе фантастычную планету Solayoh, аб якой ідзе гаворка ў песні. Блакітныя вочы і светлыя валасы спявачкі выгадна падкрэсліць падабраная грэчаскім стылістам сукенка металічна-блакітных колераў. Паводле афіцыйнай версіі, сукенка ўпрыгожана 70 тысячамі (!) крысталаў Свароўскі. Але, як жартуе беларуская каманда, падлічыць усе крысталы да апошняга пакуль што ні ў каго з іх не атрымалася, таму застаецца верыць на слова.

Дадатковых фарбаў і эфектнасці нумару павінны дадаць святлодыёдныя бубны, у якія б'юць танцоры, і адмыслова падабраная піратэхніка: салюты ды феерверк. Паводле водгукаў замежных журналістаў і фанатаў конкурсу, якія сочаць за «Еўрабачаннем» у Швецыі, з такой пастаноўкай Беларусь сёлета ўпэўнена выйдзе ў фінал.

Што пакажуць канкурэнты

Сапернікі беларускай артысткі таксама не спяць у шапку, нароўні з бясконцымі вакальнымі практыкаваннямі рыхтуючы ўсялякія запамінальныя «фішкі» для сваіх нумароў.

Напрыклад, для нумара ўкраінкі Златы Агневіч пастаноўшчыкі выпісалі з ЗША самага высокага чалавека гэтай краіны, народжанага ўкраінца Ігара Ваўкавінскага **(на фота)**. Яго рост, зафіксаваны ў Кнізе рэкордаў Гінэса — 234 см, у той час як рост самой артысткі ўсяго 165 см. Кантраст, пагадзіцеся, уражвае. Дарэчы, Іну (гэта сапраўднае імя спявачкі) у кулуарах конкурсу называюць самай прыгожай удзельніцай «Еўрабачання-2013», што, безумоўна, крыўдна для астатніх артыстак, затое дадае ўпэўненасці ёй самой.

eurovision.tv

Прадстаўніца Расіі, пераможца тэлешоу «Голас» Дзіна Гарыпава бярэ прыклад з папярэдніх пераможцаў «Еўрабачання». Яе нумар збудаваны на тым, што ўсё сапраўды эфектнае — проста. Таму, акрамя самой Дзіны і бэк-вакалістаў, на сцэне будзе толькі мноства круглых ліхтароў; асноўная ж стаўка зроблена на кранальны і моцны вакал дзяўчыны. Дарэчы, у папярэднім галасаванні прэс-цэнтра расіянцы прагназуюць 2-е месца ў гэтым паўфінале.

Гурт з Харватыі ў складзе 6 суровых мужчын выйдзе на сцэну ў рыцарскіх касцюмах і амаль не будзе рухацца падчас песні, робячы стаўку на акапэльнае выкананне.

Фаварыткай сёлетняга «Еўрабачання» паранейшаму застаецца канкурсантка з Даніі Эмелі дэ Форэст. У яе песню прыгожа ўплецены этнічныя матывы, а эфектнасці выступленню дадаюць два барабаншчыкі, якія маршыруюць, і піратэхнічныя «фішкі».

Задача перад беларускай артысткай стаіць няпростая яшчэ і таму, што з 16 удзельнікаў першага паўфіналу 11 — дзяўчаты (сольныя выканаўцы або калектывы). Вочы разбягаюцца сярод такога кветніку. Таму шчыра пажадаем Алене Ланской парадаваць, нарэшце, суайчыннікаў выхадам Беларусі ў фінал «Еўрабачання». Нагадаем, прамая трансляцыя першага паўфіналу конкурсу на каналах «Беларусь 1» і «Беларусь 24» пачнецца сёння а 22 гадзіне.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Мужчыны ў напісанні SMS-паведамленняў — жанчынам не канкурэнты

Беларускія мужчыны карыстаюцца мабільным інтэрнэтам на 32% больш актыўна, чым прадстаўніцы слабага полу.

Пра гэта, у прыватнасці, сведчыць даследаванне, праведзенае мабільным аператарам МТС. Цікава, што попыт на мабільны інтэрнэт сярод мужчын больш высокі, нават нягледзячы на тую акалічнасць, што колькасць актыўных інтэрнэт-карыстальнікаў сярод жанчын на 3% большая, чым сярод мужчын.

Затое ў карыстанні галасавымі паслугамі беларускія жанчыны паранейшаму знаходзяцца па-за канкурэнцыяй: сяроднемесячнае спажыванне галасавога трафіку жанчынай на 13% перавышае аналагічны паказчык сярод мужчын.

Захоўваюць за сабой лідарства жанчыны і ў напісанні SMS: прадстаўніцы слабага полу штомесяц адпраўляюць на 26% больш кароткіх паведамленняў, чым мужчыны.

Абаненцкая база МТС, буйнейшая ў краіне, на 52% складаецца з жанчын і на 48% — з мужчын, што практычна адлюстроўвае раздзяленне насельніцтва па гендарным крытэрыі. Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, сёння ў Беларусі пражываюць 9,5 млн чалавек — 5,1 млн жанчын і 4,4 млн мужчын. Паслугамі мабільнага аператара МТС карыстаюцца 5,23 млн беларусаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Даты | Падзеі | Людзі

1770 год — 16-гадовы наследнік французскага прастола, будучы кароль Людовік XVI ажаніўся з 14-гадовай Марыяй Антуанетай, дачкой Марыі Тэрэзіі, каралевы Аўстрыі. Вясельныя ўрачыстасці азмрочыліся двума здарэннямі: падчас вянчання ў Версалі прыдворныя, кінуўшыся да алтара, збілі з ног і да смерці затапталі амаль сто швейцарскіх гвардзейцаў. А феерверк на плошчы Людовіка XV — той самай плошчы, дзе праз 23 гады пакараюць смерцю мужа і жонку, — завяршыўся страшнай цісканінай: ашалелыя парыжане перакульвалі экіпажы, тапталі адно аднаго. Па некаторых звестках, на гэтым народным «гулянні» загінула больш за тысячу чалавек.

1905 год — нарадзілася (г. Мінск) Стэфанія Міхайлаўна Станюта, актрыса, народная артыстка Беларусі (1957), народная артыстка СССР (1988). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1982). Сцэнічную дзейнасць пачала ў 1919 годзе ў Першым таварыстве беларускай драмы і камедыі. З 1920 года — у Беларускім дзяржаўным тэатры, з 1926-га — у Другім беларускім дзяржаўным тэатры. З 1931-га — у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. Выканаўца характарных, камедыйных і драматычных роляў. Яе творчасці былі ўласцівы глыбокае пранікненне ў псіхалогію вобраза, эмацыянальнасць, выразнасць слова, жэсту, мімікі, яркая камедыйнасць, умелае выкарыстанне іроніі і гратэску. Стварыла шэраг народных характараў, у якіх падкрэсліла мудрасць, актыўную жыццёвую пазіцыю, сувязь з зямлёй, душэўную шчодрасць і чалавечнасць. Сярод лепшых роляў у тэатры: Глафіра («Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага), Дуэнья («Дзень цудоўных падманаў» Р. Шэрыдана), Марыля («Раскіданае гняздо» Я. Купалы), Мод («Гаральд і Мод» К. Хігінса і Ж.К. Кар'ера) і інш. На творчым рахунку С. Станюты больш за 60 роляў у кіно і на тэлебачанні («Белыя росы», «Чужая вотчына», «Мама, я жывы» і іншых. Памерла ў 2000 годзе.

1933 год — 80 гадоў таму нарадзіўся Аляксандр Кішчанка, беларускі мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны мастак Беларусі. Працаваў у галіне станковага і манументальнага жывапісу, стварaў роспісы, мазаікі, габелены. Сярод работ: мазаічныя пано на тарцах жылых дамоў у мікрараёне «Усход-1» і на фасадзе гасцініцы «Турыст», манументальныя габелены для будынка ААН у Нью-Ёрку і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980, 1996). Памёр ў 1997 годзе.

Было сказана

Ганна АТРОШЧАНКА:

«Не трэба ныць, а трэба жыць!
У нас — кароткая дарога...
Спяшайся дабрыню тварыць,
Шануй бацькоў, Радзіму, Бога».

А ПРА 44 ТЫСЯЧЫ ЕЎРА ЗАБЫЎ?

Распачата крымінальная справа ў дачыненні да дырэктара аршанскага прыватнага транспартнага ўнітарнага прадпрыемства, які «забыў», што заробленыя за мяжой яго фірмай 44,1 тысячы еўра абавязкова трэба было пералічыць на банкаўскі рахунак у Беларусі.

Як паведамілі супрацоўнікі Аршанскага міжраённага аддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Віцебскай вобласці, гэтая валютная сума наяўнымі грашыма была перададзена за выкананне міжнародных перавозак грузаў для фірмы з Германіі. А ў адпаведнасці з беларускім заканадаўствам валюта ў такім выпадку падлягае абавязковаму пералічэнню на рахункі ва ўпаўнаважаны беларускі банк. Паколькі гэта не было зроблена, фактычна дырэктарам фірмы гэтыя еўра былі схаваны ад бухгалтарскага і падатковага ўліку.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УКРАЎ ВАЕННЫЯ МЕДАЛІ

У Маларыце асуджаны грамадзянін, які ўкраў узнагароды ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны і прадаваў іх за бясцэнак.

Да сваіх 32 гадоў мужчына замест працоўнага стажу назапасіў толькі некалькі судзімасцяў. Ад жонкі ён даведаўся, што ў яе сяброўкі памёр дзед, удзельнік вайны, а яго ўзнагароды захоўваюцца ў вясковай хаце. Ноччу зламыснік залез у нежылы дом, забраў адтуль медалі і сякія-такія рэчы. Пакуль яго затрымалі, ён паспеў прадаць знаёмаму два баявыя медалі па 30 тысяч рублёў. Той, у сваю чаргу, іх перапрадаў ужо па 200 тысяч рублёў за кожны. Астатнія чатыры юбілейныя медалі знайшлі ў злодзея дома. Суд вызначыў меру пакарання выкрадальніку ўзнагарод — два гады абмежавання волі.

Яна СВЕТАВА.



Яўгена ПЯСЕЦКАГА

ФОТА СЛОВА

Шукае Вецер,
дзе схаваўся Неруш, —
Гукае ў вершалінах,
кліча ў полі,
У шыбы б'е,
грукоча на стадоле —
Адно каб толькі з дружбаком
спаткацца!
Але не ўмее Неруш адгукацца.

Чакае Неруш,
каб вярнуўся Вецер.
Яны як родныя, з адной калыскі,
Іх маці — Бура — песціла калісьці.
Але разбегліся шляхі па свеце.
Не прылятае двойчы
той жа вецер.

Дзе ж вы, мае сябры
ў жыцці вірлівым?
Ці з ветрам вы,
ці з нерушам маўклівым?



СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	5.11	21.02	15.51
Віцебск	4.54	20.58	16.04
Магілёў	5.00	20.53	15.53
Гомель	5.04	20.42	15.38
Гродна	5.27	21.17	15.50
Брэст	5.34	21.10	15.36

Месяц

Маладзік 10 мая.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Васіля, Даната, Ігната, Максіма, Мікіты, Якава.*
К. *Глорыі, Жанны, Магдалены, Андрэя, Германа, Роберта.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

У адэскім аўтобусе едзе жанчына і размаўляе па мабільным:

— ...І ты ўяўляеш, Софачка, заходжу я ў нашу спальню, а ён з суседкай там куляецца на ложку. Ну я ціхенька пайшла на кухню, узяла... Вой, Софачка, мой прыпынак, я ў шэсць з працы паеду і дараскажу.

Шэсць гадзін вечара. Тая ж жанчына садзіцца ў аўтобус, а ў аўтобусе ўсё тыя ж асобы сядзяць. Тут заскоквае яшчэ адзін мужык задыханы, ледзь пераводзіць дух:

— Я не спазніўся?

Глядзіць на жанчыну і кажа:

— Ну што глядзіш? Тэлефануй Софачцы!

Глупства гэты ваш серыял, ні аб чым! Гляджу за дзень ужо 6 серыю, ужо 3 серыі хачу есці, 2 серыі ў прыбіральню... ДАПАМАЖЫЦЕ-Е!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 61, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 24.217. Індэкс 63850. Зак. № 2105.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 мая 2013 года.